Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-03-28

*Прэзентацыя*

# Модныя і розныя




Цяпер модна шукаць гербы сваёй сям'і, роднага горада ці вёскі і даведвацца пра іх значэнні. А раптам твае продкі былі шляхціцамі, а ў герба малой радзімы найцікавейшая гісторыя? Гэта прэстыжна! Мабыць, менавіта таму сёння карыстаюцца надзвычайнай папулярнасцю гісторыка-геральдычныя даследаванні. Такія працы з'яўляюцца не надта часта. Для іх напісання трэба назбіраць столькі цікавай інфармацыі, схаванай гадамі і стагоддзямі!

Але ёсць людзі, якія прысвяцілі гэтай цяжкой і цікавай працы многія гады. Напрыклад, вядомы прафесар, доктар гістарычных навук, член Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Сяргей Рассадзін. У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя яго кнігі «Галантны век» у гербах гарадоў Беларусі: гісторыка-геральдычнае даследаванне», што выйшла ў Выдавецкім доме «Беларуская навука». Гаворка ідзе пра апошнюю чвэрць XVIII стагоддзя. Менавіта ў гэты час было ўтворана каля паловы гістарычных гербаў беларускіх гарадоў. Дарэчы, Сяргею Яўгенавічу на збор матэрыялу для манаграфіі спатрэбілася каля 10 гадоў.

У кнізе — гісторыка-геральдычныя даследаванні гербаў беларускіх гарадоў, зацверджаных у канцы XVIII стагоддзя. Таму і цікавае гэтае выданне не толькі навукоўцам і гісторыкам, але і звычайным людзям, якія хочуць больш ведаць пра гісторыю свайго горада і роду.

— Скласці каталог і ўпрыгожыць яго выявамі гербаў цяжкасці не складае, але які ў гэтым сэнс? — кажа Сяргей Яўгенавіч. — Падобнага — колькі хочаш. Справа ў іншым — зразумець, што за гэтым шыфрам хаваецца, паглыбіцца ў яго сэнс.

Падчас мерапрыемства наведвальнікі мелі магчымасць пазнаёміцца і з выстаўкай «Герб як гістарычная крыніца», падрыхтаванай супрацоўнікамі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі. Тут можна было ўбачыць дакументы другой чвэрці XVIII — XXI стагоддзя, прысвечаныя гербам і геральдыцы.

**Марыя ГАЛУБЦОВА**

Марыя Галубцова. Модныя і розныя